# Рэкамендацыі
# па эфектыўным выкарыстанні
# электроннага адукацыйнага дапаможніка
# «WEB-скарбонка “Беларуская мова. 5 клас”» (у дзвюх частках)
# на ўроках беларускай мовы
# з вучнямі з АПФР (з цяжкасцямі ў навучанні)

Электронны адукацыйны дапаможнік «WEB-скарбонка “Беларуская мова. 5 клас”» (у дзвюх частках) створаны ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай па вучэбным прадмеце “Беларуская мова” для V класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання [4, с. 5–14] і адпавядае зместу вучэбнага дапаможніка «Беларуская мова» для 5 класа (у дзвюх частках) 2024 года выдання [1,2].

Распрацоўка абумоўлена практычнай накіраванасцю і арыентавана на рэалізацыю кампетэнтнаснага, сістэмна-функцыянальнага, камунікатыўна-дзейнаснага, лінгвакультуралагічнага і сацыякультурнага падыходаў, якія садзейнічаюць фарміраванню прадметных кампетэнцый і функцыянальнай адукаванасці па беларускай мове.

У аснову пакладзены наступныя прынцыпы: сістэмна-функцыянальны, камунікатыўна-рытарычны, навуковасці, планамернасці, паслядоўнасці, сувязі з практыкай, даступнасці, мінімізацыі моўнага і маўленчага тэарэтычнага матэрыялу, прынцып уліку ўзроставых і псіхалагічных асаблівасцей вучняў з цяжкасцямі ў навучанні.

Электронны адукацыйны дапаможнік «WEB-скарбонка “Беларуская мова. 5 клас”» (у дзвюх частках) − гэта значны інструмент данясення вучэбнага матэрыялу да вучняў з цяжкасцямі ў навучанні, памочнік ва ўспрыманні, разуменні і аналізе інфармацыі. Праз яго выкарыстанне павышаецца якасць засваення вучэбнага матэрыялу па беларускай мове, што станоўча ўплывае на вучэбную матывацыю і эфектыўнасць навучання, дазваляе ажыццяўляць індывідуальны падыход, актывізаваць пазнавальную дзейнасць, развіваць камунікатыўныя навыкі вучняў. Дыдактычны матэрыял, змешчаны ў дадзенай распрацоўцы, мае на мэце аказаць настаўніку дапамогу ў фарміраванні прадметных кампетэнцый і функцыянальнай адукаванасці ў вучняў з цяжкасцямі ў навучанні.

WEB-скарбонка мае структуру сайта, складаецца з дзвюх частак (адпаведна з часткамі і зместам вучэбнага дапаможніка): «WEB-скарбонка “Беларуская мова. 5 клас” (1 частка)» і «WEB-скарбонка “Беларуская мова. 5 клас” (2 частка)». Першая і другая часткі ўзаемазвязаны паміж сабой актыўнымі спасылкамі.

Электронны адукацыйны дапаможнік распрацаваны з дапамогай праграм Google Сайты, Microsoft PowerPoint, сэрвісу па стварэнні анлайн-пазлаў Jigsaw Planet, канструктараў інтэрактыўных заданняў LearningApps і Wordwall, генератара рэбусаў “Рэбус № 1”, анлайн-сэрвісу Google Формы, генератара QR-кодаў.

Кожная частка WEB-скарбонкі мае зручную навігацыю: на галоўнай старонцы размешчаны змест з актыўнымі спасылкамі, анатацыя, адпаведны электронны варыянт часткі вучэбнага дапаможніка, рэкамендацыі па выкарыстанні і прымяненні электроннага дапаможніка, меню, якое ўзаемазвязана са зместам.

Для фарміравання прадметных кампетэнцый і функцыянальнай адукаванасці да кожнай тэмы распрацаваны інтэлект-карты, схемы, табліцы, рэбусы, анлайн-пазлы, інтэрактыўныя заданні і анлайн-тэсты ў сэрвісах Web 2.0, якія ў сваю чаргу склалі змест электроннага адукацыйнага дапаможніка «WEB-скарбонка “Беларуская мова. 5 клас”». На кожнае інтэрактыўнае практыкаванне, анлайн-пазл і анлайн-тэст дадзены QR-коды і актыўныя спасылкі.

Пры стварэнні схем, інтэлект-карт, анлайн-тэстаў, анлайн-пазлаў, рэбусаў, інтэрактыўных практыкаванняў і заданняў захоўваліся асноўныя патрабаванні: надзённасць, змястоўнасць, інфарматыўнасць, цікавасць візуалізацыі, адпаведнасць узроўню складанасці вучэбнага матэрыялу мэтам навучання, узросту і асаблівасцям пазнавальнай дзейнасці вучняў з цяжкасцямі ў навучанні, адпаведнасць зместу праграмы і вучэбнага дапаможніка, аднасэнсоўнасць пытанняў і заданняў, выразная і дакладная фармулёўка.

Электронны адукацыйны дапаможнік у сваім складзе мае даведачна-інфармацыйны (ведавы), інтэрактыўны (аперацыйны), кантрольна-дыягнастычны (практычны) блокі, што ў сукупнасці і складае змест навучання.

*Даведачна-інфармацыйны кампанент* уключае тэарэтычны матэрыял у выглядзе інтэлект-карт, схем, табліц, анлайн-пазлаў і рэбусаў, распрацаваных аўтарам у праграмах Microsoft PowerPoint, Рэбус № 1, Jigsaw Planet.

Інтэлект-карты могуць выкарыстоўвацца як самастойна (у якасці нагляднасці), так і ва ўзаемасувязі з канкрэтным тэарэтычным матэрыялам (як графічная ілюстрацыя правіла). На вучэбных занятках з інтэлект-картамі, схемамі і табліцамі можна работаць пры выкладанні новага матэрыялу, для асэнсавання і замацавання вучэбнага матэрыялу, фарміравання ўменняў і навыкаў, пры абагульненні і сістэматызацыі, на этапе кантролю ведаў. Сродкі візуалізацыі могуць дэманстравацца як на інтэрактыўнай дошцы, так і ў раздрукаваным варыянце ў фармаце А3 на класнай дошцы. Пажадана, каб яны былі і ў вучняў.

На працягу ўрока неабходна звяртацца да зместу інтэлект-карты падчас выканання разнастайных практыкаванняў і франтальнага апытвання. Найбольш поўнае запамінанне тэарэтычнага матэрыялу, змешчанага ў інтэлект-карце, дасягаецца пры дапамозе разнастайных пытанняў па змесце карты. Матэрыял пададзены лагічна, паслядоўна, з прывядзеннем прыкладаў.

Тэарэтычны матэрыял, змешчаны ў інтэлект-картах, з’яўляецца адначасова і апорнымі словамі, якія дапамагаюць вучням строіць вуснае

выказванне, фармуляваць правіла, у выніку чаго адбываецца развіццё маўленчай і аналітычнай дзейнасці.

Прыём выкарыстання рэбусаў ажыўляе працу вучняў на ўроку, павышае іх працаздольнасць і дазваляе інтэнсіфікаваць навучальны працэс, выхоўвае цікавасць вучняў да беларускай мовы і станоўча ўздзейнічае на эмацыянальны стан вучняў. Разгадваючы гатовыя рэбусы і складаючы свае ўласныя, дзеці развіваюць кемлівасць, уяўленне, інтуіцыю і памяць. Гэта адзін з прыёмаў педагагічнага майстэрства, які дазваляе актывізаваць жаданне дзяцей вучыцца. Рэбусы могуць быць выкарыстаны ў любы момант урока. Напрыклад, на пачатку ўрока як шыфроўка для вызначэння тэмы ўрока.

Анлайн-пазлы інэлект-карт можна выкарыстоўваць пасля азнаямлення з тэарэтычным матэрыялам з мэтай замацавання або праверкі яго разумення, а таксама ў якасці праблемнага пытання. З дадзеным метадам можна работаць пры франтальным, калектыўным, групавым, парным і індывідуальным навучанні. Праца з анлайн-пазламі дазваляе актывізаваць вучэбна-пазнавальную дзейнасць вучняў, развіваць увагу, засяроджанасць вучняў, а таксама спрые развіццю ўмення збіраць, узнаўляць у памяці і аналізаваць атрыманую інфармацыю.

Збіраючы карцінку з частак, вучань успамінае, дзе якая дэталь знаходзілася, прагаворваючы яшчэ раз тэарэтычны матэрыял. Такім чынам у дзяцей актывізуецца разумовая дзейнасць, творчыя здольнасці і падключаецца ўяўленне. Праца з пазламі вучыць канцэнтравацца і дасягаць пастаўленых мэт.

Дадзены метад з'яўляецца адным з такіх інструментаў, якія дазваляюць настаўніку ўзмацніць цікавасць вучняў да працы з тэарэтычным матэрыялам, фарміраваць моўную, маўленчую і камунікатыўную кампетэнцыі.

Дыдактычны матэрыял даведачна-інфармацыйнага кампанента спрыяе фарміраванню прадметных кампетэнцый і функцыянальнай адукаванасці праз засваенне вучнямі з цяжкасцямі ў навучанні тэарэтычнага матэрыялу па кожнай тэме вучэбнай праграмы для 5 класа, развіццю ўменняў карыстацца мовай у розных відах маўленчай дзейнасці на аснове авалодання маўленчай тэорыяй і культурай маўлення, спосабам і перадачы думкі ў вуснай форме, уменняў ствараць самастойныя вусныя выказванні. На першы план у моўнай падрыхтоўцы вучняў выходзіць удасканаленне іх маўленчай практыкі, якая наладжваецца ў форме суразмоўніцтва.

З дапамогай візуалізацыі складаны і аб’ёмны вучэбны матэрыял лепш тлумачыцца, што дазваляе засяродзіць увагу вучняў на найбольш галоўных момантах, зразумець сутнасць сказанага, прачытанага, убачанага.

*Інтэрактыўны кампанент* змяшчае інтэрактыўныя заданні, распрацаваныя ў канструктарах інтэрактыўных заданняў LearningApps і Wordwall, якія выкарыстоўваюцца для рэалізацыі актыўна-дзейнасных формаў навучання, забеспячэння ўмоў індывідуалізацыі і дыферэнцыяцыі навучання.

Інтэрактыўныя заданні дазваляюць стымуляваць дзяцей, кантраляваць іх веды на розных узроўнях замацавання вучэбнага матэрыялу, а таксама павышаць матывацыю і зацікаўленасць да вывучэння беларускай мовы. Выконваючы практыкаванні такога тыпу, вучні правяраюць свае веды ў гульнявой форме, што спрыяе фарміраванню не толькі моўнай кампетэнцыі, але і фарміраванню функцыянальнай адукаванасці, асабліва, калі яны накіраваны на вырашэнне практычных задач, аналіз інфармацыі і прымяненне ведаў у рэальных сітуацыях. Гэта залежыць ад зместу інтэрактыўных практыкаванняў і іх здольнасці развіваць такія навыкі, як разуменне тэксту і лагічнае мысленне. Таму распрацаваныя практыкаванні і заданні вельмі разнастайныя па сваёй будове: класіфікацыя, знайдзі пару, групавое сартаванне, параўнанне, знайдзі пару, праўда ці хлусня, анаграма, закончы сказ, прывядзі ў парадак, адкрой поле, віктарына з правільным выбарам адказу, упішы слова, складзі пазл, гульня “Хто хоча стаць мільянерам?”.

Інтэрактыўныя практыкаванні выкарыстоўваюцца ў якасці самастойнай індывідуальнай ці калектыўнай работы на інтэрактыўнай дошцы. У такім выпадку значная ўвага ўдзяляецца не толькі фарміраванню моўнай кампетэнцыі, але і маўленча-камунікатыўнай.

Адзначаны дыдактычны матэрыял дазваляе кантраляваць веды вучняў на розных узроўнях замацавання вучэбнага матэрыялу і панізіць трывожнасць дзяцей.

*Кантрольна-дыягнастычны кампанент* уключае анлайн-тэсты, распрацаваныя ў сэрвісе Google Формы, якія дазваляюць ажыццяўляць розныя віды кантролю і дыягнаставаць прабелы ў ведах вучняў.

Тэставыя заданні выкарыстоўваюцца пасля вывучэння пэўнага аб’ёму вучэбнага матэрыялу і забяспечваюць паэтапны кантроль за фарміраваннем вызначаных вучэбнай праграмай ведаў, уменняў і навыкаў. Такая форма кантролю і дыягностыкі садзейнічае развіццю лагічнага мыслення, памяці, дапамагае ўдасканальваць культуру навучання, навыкі самаацэнкі, самаадукацыі і адказнага стаўлення да працэсу навучання.

Выканаўшы тэст, вучні маюць магчымасць адразу ўбачаць плён сваіх старанняў у выглядзе адзнак, прагледзець няправільныя адказы і выканаць работу над памылкамі. Педагог у сваю чаргу мае магчымасць прааналізаваць зводную статыстыку ў сваім рахунку Google па ўсім класе, няправільныя адказы вучняў, унесці карэктывы пры планаванні наступнага ўрока і індывідуальнай карэкцыйнай работы.

Карысць анлайн-тэстаў заключаецца ў тым, што настаўнік бачыць агульную зводку па адказах, статыстыку па асобных пытаннях, што дазваляе дакладна высветліць праблемы і прабелы ў засваенні вучэбнага матэрыялу, скарэкціраваць і індывідуалізаваць далейшае навучанне.

Дыдактычныя матэрыялы, размешчаныя ў дадзеным рэсурсе, маюць на мэце аказаць настаўніку дапамогу ў фарміраванні прадметных кампетэнцый і функцыянальнай адукаванасці ў вучняў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

З электронным адукацыйным дапаможнікам можна працаваць за камп’ютарам, з планшэтам, тэлефонам і на інтэрактыўнай дошцы. Для выканання інтэрактыўных практыкаванняў, анлайн-тэстаў, складання анлайн-пазлаў неабходны выхад у інтэрнэт.

Прапануецца для выкарыстання на ўроках, на падтрымліваючых і факультатыўных занятках, а таксама для самастойнай працы.

З улікам канкрэтнай навучальнай сітуацыі можна дапоўнць або змяніць змест інтэрактыўных практыкаванняў і заданняў, інтэлект-карт, схем і табліц, анлайн-тэстаў, размеркаваць заданні паміж групамі вучняў, зважаючы на індывідуальныя асаблівасці, прапанаваць выканаць заданне цалкам, часткова ці выбарачна. Акрамя таго, вучань сам можа выбраць час і месца для навучання.

Адрасуецца настаўнікам беларускай мовы, вучням II ступені агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама іх законным прадстаўнікам.

WEB-скарбонка “Беларуская мова. 5 клас” размешчана ў агульным доступе ў інтэрнэце: https://sites.google.com/view/web-skarbonka?usp=sharing.

**Спіс інфармацыйных крыніц**

1. Валочка Г.М. і інш. Беларуская мова : падручнік для 5 класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. У 2 ч. Ч. 1. – Мінск : Акадэмія адукацыі, 2024.
2. Валочка Г.М. і інш. Беларуская мова : падручнік для 5 класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. У 2 ч. Ч. 2. – Мінск : Акадэмія адукацыі, 2024.
3. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для V класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання, зацверджаная Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 29.07.2025 № 134.